**3.** Сістэматызуйце інфармацыю аб развіцці беларусазнаўства ў XIX — пачатку XX ст., запоўніўшы табліцу:

| Галіна навуковых ведаў | Прозвішчы навукоўцаў, даследчыкаў | Вынікі даследаванняў |
|---|---|---|
| | | |

**4.** Растлумачце прычынна-выніковую сувязь паміж уздымам грамадска-палітычнага руху ў XIX — пачатку XX ст. і актывізацыяй вывучэння гісторыі і культуры беларускага народа.

**5.** Якія помнікі архітэктуры XIX — пачатку XX ст. захаваліся ў вашым населеным пункце? Падрыхтуйце прэзентацыю пра іх для ўрока «Наш край».

## § 25. Культура Беларусі ў 1920–1930-я гг.

§ 25-1

§ 25-2

**1.** Якімі былі асноўныя дасягненні беларусазнаўства ў другой палове XIX — пачатку XX ст.?

**2.** Якімі былі асаблівасці нацыянальнай і канфесійнай палітыкі польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.?

**Палітыка беларусізацыі.** У пачатку 1920-х гг. эканамічныя і грамадска-палітычныя працэсы ў БССР спрыялі актывізацыі нацыянальна-культурнага жыцця, праявай якой стала палітыка беларусізацыі.

*Пералічыце асноўныя кірункі палітыкі беларусізацыі.*

У 1924—1928 гг. былі створаны адпаведныя ўмовы для навуковай распрацоўкі праблем беларускай мовы, яе гісторыі, сучаснай лексікі і граматычных норм, тэрміналогіі на аснове вывучэння народнай мовы.

Ажыццяўляўся паступовы пераход да выкарыстання беларускай мовы ў дзяржаўным апараце, установах адукацыі, навукі, культуры, тэрытарыяльных часцях Чырвонай арміі. Беларуская мова ўводзілася таксама на рабфаках, у школах рабочай і сялянскай моладзі, у партыйных і камсамольскіх школах. У якасці абавязковых прадметаў вывучаліся гісторыя, эканоміка і геаграфія Беларусі, беларуская літаратура. Да 1928 г. 80 % агульнаадукацыйных школ перайшлі на беларускую мову навучання. Значна павялічылася колькасць кніг, перыёдыкі на беларускай мове.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Надпіс на 4 мовах на будынку чыгуначнага вакзала. Мінск. 1920-я гг.

У канцы 1920-х гг. пачалося паступовае згортванне палітыкі беларусізацыі. Гэта было звязана з нарастаннем тэндэнцый цэнтралізацыі ў Савецкім Саюзе.

**Развіццё сістэмы адукацыі ў Савецкай Беларусі.** У 1920-я гг. першачарговымі задачамі былі развіццё адукацыі на роднай мове, ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці, падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў. Для вырашэння гэтых задач неабходна было стварыць новую сістэму адукацыі.

*Абмяркуйце, чаму ліквідацыя непісьменнасці сярод насельніцтва была адной з самых важных задач савецкай дзяржавы.*

У 1922 г. у БССР уводзілася пачатковая чатырохгадовая школа, а таксама школа з сямігадовым тэрмінам навучання. З 1926 г. навучанне ў пачатковай школе стала абавязковым. У 1931/1932 навучальным годзе 98 % дзяцей ва ўзросце ад 8 да 11 гадоў былі ахоплены пачатковым навучаннем.

Істотныя змены ў сістэме адукацыі адбыліся ў 1930-я гг. У школах рэспублікі была адноўлена класна-ўрочная сістэма навучання са строга вызначаным раскладам і пастаянным саставам навучэнцаў (яна была адменена бальшавікамі пасля кастрычніка 1917 г.). Навучальныя групы-брыгады зноў пачалі называцца класамі. Уводзіліся пасада класнага кіраўніка, школьная форма, вучнёўскі білет, аднаўляліся штодзённыя дамашнія заданні.

Кадры кваліфікаваных рабочых рыхтавалі прафесійныя школы і школы фабрычна-заводскага вучнёўства. Ажыццяўлялася таксама вытворча-тэхнічнае навучанне на фабрыках і заводах без адрыву ад вытворчасці.

Далейшае развіццё атрымала сярэдняя спецыяльная адукацыя. Былі створаны новыя сельскагаспадарчыя, індустрыяльныя, педагагічныя, медыцынскія і іншыя навучальныя ўстановы. У 1939/1940 навучальным годзе ў БССР працавала 102 тэхнікумы, у якіх налічвалася каля 34 тыс. навучэнцаў.

Падрыхтоўка спецыялістаў ажыццяўлялася ў вышэйшых навучальных установах. У 1921 г. быў заснаваны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у складзе рабочага

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



У. Пічэта (1878–1947) — першы рэктар БДУ

і медыцынскага факультэтаў і факультэта грамадскіх навук. Першым рэктарам быў прызначаны вядомы гісторык-славіст У. Пічэта.

Акрамя БДУ ў БССР былі адкрыты камуністычны ўніверсітэт у Мінску, Віцебскі ветэрынарны інстытут, Горацкая сельскагаспадарчая акадэмія, Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі і інш. Усяго да канца 1930-х гг. у БССР працавала больш за 20 вышэйшых навучальных устаноў, у якіх навучалася 15,5 тыс. студэнтаў.

**Станаўленне беларускай савецкай навукі.** У 1920-я гг. зараджаецца беларуская савецкая навука. У 1922 г. быў створаны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Ён стаў вышэйшай дзяржаўнай навуковай установай рэспублікі, асноўнай задачай якой з’яўлялася каардынацыя ўсёй навуковай працы ў БССР. Першым старшынёй Інбелкульта быў прызначаны С. Некрашэвіч, у 1925 г. яго змяніў У. Ігнатоўскі. У арганізацыі і працы Інбелкульта прымалі ўдзел Д. Жылуновіч, У. Пічэта, Я. Карскі, Я. Купала, Я. Колас, І. Лёсік, З. Бядуля, М. Гарэцкі і інш.

12 кастрычніка 1928 г. Бюро Цэнтральнага камітэта Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі прыняло рашэнне аб стварэнні на аснове Інстытута беларускай культуры Беларускай акадэміі навук (з 1936 г. — Акадэмія навук БССР). Першым прэзідэнтам Акадэміі навук стаў вядомы гісторык У. Ігнатоўскі.

*Абмяркуйце, чаму адкрыццё Акадэміі навук лічыцца новым этапам у развіцці беларускай навукі.*



Будынак Беларускай акадэміі навук у 1930-я гг.

Пачаўся новы этап у развіцці айчыннай навукі. Навукоўцы Акадэміі навук займаліся пошукам карысных выкапняў, гідраэнергетычных рэсурсаў, даследаваннем праблем арганічнай і неарганічнай хіміі, павышэння ўраджайнасці, распрацоўвалі праблемы гісторыі, беларускай мовы і літаратуры, філасофіі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Ажыццяўленне культурнай рэвалюцыі.** У 1920—1930-я гг. у СССР і БССР праводзіліся актыўныя пераўтварэнні ў галіне навукі, культуры, адукацыі, якія атрымалі назву **«культурнай рэвалюцыі»**.




Агітацыйны плакат «Далоў непісьменнасць!». Мастак *А. Я. Быхоўскі*. 1923 г.

Працягвалася праца па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. У гэтай працы прымалі ўдзел калектывы фабрык і заводаў, калгасаў і саўгасаў, арганізацый і ўстаноў, настаўнікі, школьнікі, усе пісьменныя людзі. У выніку колькасць пісьменнага насельніцтва ва ўзросце дзевяці гадоў і старэй павялічылася ў БССР з 53 % у 1926 г. да амаль 79 % у 1939 г. Такім чынам, масавая непісьменнасць у БССР была ліквідаваная. Але цалкам вырашыць гэтую праблему да канца 1930-х гг. не ўдалося. Значная частка дарослага насельніцтва (асабліва жыхары вёскі, пераважна жанчыны) не вучылася.

XVIII з'езд ВКП(б) у 1939 г. паставіў задачу ажыццяўлення ўсеагульнай сярэдняй адукацыі ў горадзе і завяршэння пераходу да ўсеагульнага сямігадовага навучання ў вёсцы і ва ўсіх нацыянальных рэспубліках.

**Беларуская савецкая літаратура, музыка, тэатр.** 1920-я гг. былі адзначаны росквітам беларускай літаратуры. У гэты час узніклі літаратурныя аб'яднанні «Маладняк» (1923 г.), «Узвышша» (1926 г.), «Полымя» (1927 г.). Плённа працавалі беларускія пісьменнікі Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны, М. Гарэцкі. У літаратуры пісьменнікі павінны былі прытрымлівацца **метаду сацыялістычнага рэалізму**, які патрабаваў праўдзівага, гістарычна канкрэтнага малюнка рэчаіснасці ў яе рэвалюцыйным развіцці. Пры гэтым акцэнт рабіўся на адлюстраванні поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва, паказе савецкага чалавека ў якасці творцы і гаспадара новага жыцця.



Удзельнікі літаратурнага аб'яднання «Маладняк». 1920-я гг.

У 1920—1930-я гг. паспяхова развівалася музычнае мастацтва.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*На прыкладзе вядомага вам твора беларускай літаратуры 1920–1930-х гг. пакажыце, як у яго змесце рэалізаваны метад сацыялістычнага рэалізму.*

У гарадах адкрываліся музычныя тэхнікумы і школы, з'яўляліся гурткі мастацкай самадзейнасці, свае дзверы адчынілі новыя тэатры і канцэртныя залы. У музычную творчасць прыйшло новае пакаленне таленавітых выканаўцаў: Л. Александроўская, Р. Млодэк, М. Дзянісаў.

Заснавальнікамі беларускай савецкай оперы, сімфоніі, камернай музыкі з'яўляюцца М. Чуркін, М. Аладаў, Я. Цікоцкі. У 1924 г. была пастаўлена першая беларуская опера на рэвалюцыйную тэму — «Вызваленне працы» М. Чуркіна. Кампазітар Я. Цікоцкі стварыў Першую сімфонію, якая была прысвечана вызваленню Беларусі ад польскіх акупантаў, а таксама напісаў оперу «Міхась Падгорны».

У 1932 г. адбылося адкрыццё Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, а ў 1933 г. — Беларускага тэатра оперы і балета. У развіцці музычнага мастацтва важную ролю адыграла створаная ў 1937 г. у Мінску Беларуская дзяржаўная філармонія. У яе склад увайшлі сімфанічны аркестр і аркестр народных інструментаў, ансамбль народнай песні і танца, харавая капэла.

**Ларыса Пампееўна Александроўская** валодала выдатнымі вакальнымі дадзенымі. Як спявачка пачала выступаць з 1920 г. у трупе тэатра Галоўпалітпрасвета Заходняга фронту. У 1924–1928 гг. вучылася ў Мінскім музычным тэхнікуме, у 1930–1933 гг. займалася ў дзяржаўнай студыі оперы і балета (Мінск). З 1933 г. — салістка Беларускага тэатра оперы і балета ў Мінску. Таксама выступала як канцэртная і эстрадная спявачка, выконвала беларускія народныя песні і камерныя творы. У гады Вялікай Айчыннай вайны выступала з канцэртамі на франтах, у шпіталях і ў партызанскіх атрадах. З 1951 па 1960 г. была галоўным рэжысёрам Беларускага тэатра оперы і балета.



Л. П. Александроўская (1902–1980), беларуская савецкая оперная спявачка, народная артыстка СССР


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Важную ролю ў станаўленні беларускага тэатральнага мастацтва адыграў Беларускі першы дзяржаўны тэатр, адкрыты ў Мінску ў 1920 г. (сучасны Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы) пад кіраўніцтвам Ф. Ждановіча. Яго справу працягнуў таленавіты беларускі драматург Е. Міровіч. Паралельна дзейнічала тэатральная трупа пад кіраўніцтвам У. Галубка. У 1926 г. яна была ператворана ў Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр. У 1926 г. у Віцебску адкрыўся другі беларускі драматычны тэатр (сучасны Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа), трупу якога склалі выпускнікі беларускай драматычнай студыі пры МХАТе (Маскоўскі мастацкі акадэмічны тэатр).

У 1932 г. Беларускі вандроўны тэатр быў рэарганізаваны ў трэці беларускі дзяржаўны тэатр з базай у Гомелі. У. Галубку першаму ў рэспубліцы было прысвоена званне народнага артыста БССР. Выдатныя майстры сцэны — У. Крыловіч, Б. Платонаў, У. Уладамірскі, Ф. Ждановіч, П. Малчанаў, А. Ільінскі, Л. Ржэцкая — сваёй творчасцю паднялі на новую, больш якасную прыступку нацыянальнае тэатральнае мастацтва.

У 1930-я гг. былі адкрыты новыя тэатры — Тэатр юнага гледача БССР (1931 г.), Дзяржаўны рускі тэатр БССР (1932 г.), абласныя тэатры. У 1937 г. у рэспубліцы дзейнічала 15 тэатраў.

**Зараджэнне беларускага кіно.** У 1920-я гг. беларускі кінематограф пачаўся са здымкаў дакументальных фільмаў. За 1925—1926 гг. аператар М. Лявонцьеў зняў больш за 30 стужак, у тым ліку «Меліярацыя БССР», «У здаровым целе — здаровы дух». У 1928 г. у Ленінградзе была адкрыта кінастудыя «Савецкая Беларусь», якая ў 1929 г. пераехала ў Мінск.



Кадр з мастацкага фільма «Лясная быль». Рэжысёр *Ю. Тарыч.* 1926 г.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Бітва на Нямізе. Мастак *М. Філіповіч.* 1922 г.

Вядучай у кінематаграфіі была тэма барацьбы беларускага народа за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Першы беларускі мастацкі фільм (яшчэ нямы) па сцэнарыі М. Чарота «Лясная быль» быў зняты ў 1926 г. вядомым рэжысёрам Ю. Тарычам. Галоўным героем фільма быў юны партызанскі разведчык Грыша, які ўдзельнічае ў барацьбе з польскімі інтэрвентамі. Сярод лепшых фільмаў для дзяцей была экранізацыя аповесці Я. Маўра «Палескія рабінзоны» (1934 г., рэжысёры І. Бахар і Л. Малчанаў).



Лірнік. Скульптар *А. Грубэ.* 1926 г.

**Выяўленчае мастацтва Савецкай Беларусі.** У 1920-я гг. цэнтрам выяўленчага мастацтва заставаўся Віцебск. Тут актыўна працавала народная мастацкая школа, заснаваная М. Шагалам. У 1923 г. яна была рэарганізавана ў мастацкі тэхнікум. З Віцебскам звязана творчасць мастака, заснавальніка супрэматызму К. Малевіча. Ідэі віцебскіх мастакоў-авангардыстаў вызначылі ў далейшым многія знаходкі і дасягненні сусветнай архітэктуры, дызайну, кніжнай і прамысловай графікі.

Нацыянальная тэматыка, гістарычныя і культурныя традыцыі беларускага народа, яго побыт знайшлі адлюстраванне ў творчасці выдатных беларускіх мастакоў, графікаў, скульптараў: М. Ста-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

нюты, М. Філіповіча, А. Тычыны, А. Грубэ, А. Бразера і інш. Барацьба за ўладу Саветаў, падзеі Грамадзянскай вайны і сацыялістычнага будаўніцтва сталі вядучай тэмай работ І. Ахрэмчыка.

*Ці можна зрабіць выснову аб тым, што ў беларускім жывапісе ў 1930-я гг. зацвердзіўся метад сацыялістычнага рэалізму?*

**Архітэктура.** У 1920—1930-я гг. ствараюцца праекты забудоў гарадоў, рабочых пасёлкаў, унікальныя манументальныя аб'екты.

Выбітнымі архітэктурнымі будынкамі 1930-х гг. сталі Дом урада, Дом Чырвонай арміі, будынкі Акадэміі навук, Тэатра оперы і балета (архітэктар І. Лангбард), Рэспубліканскага тэатра юнага гледача, Мінскага палаца піянераў і школьнікаў (архітэктары А. Воінаў, У. Вараксін) у Мінску, а таксама новыя будынкі ў Магілёве, Віцебску, Гомелі і іншых гарадах.

**Культура Заходняй Беларусі. Стан адукацыі ва ўмовах правядзення польскімі ўладамі палітыкі паланізацыі.** Культура Заходняй Беларусі развівалася ва ўмовах жорсткай паланізацыі. Польскія ўлады перашкаджалі атрыманню адукацыі на беларускай мове, нягледзячы на ўмовы Рыжскага мірнага дагавора. Калі ў 1924 г. у краі працавала 400 беларускіх школ і 8 гімназій, то да 1938/1939 навучальнага года яны былі альбо зачынены, альбо пераведзены на польскую мову навучання. Усяго да пачатку 1939 г. дзейнічала 54 гімназіі і 8 семінарый.



Будынак Тэатра оперы і балета. Архітэктар *І. Лангбард*. 1930-я гг.

Каля 13 % дзяцей школьнага ўзросту ў школе не вучыліся, больш за палову дзяцей ва ўзросце да 10 гадоў былі непісьменнымі. Высокая плата за навучанне, навучанне на польскай мове, нацыянальная прыналежнасць — усё гэта стрымлівала доступ заходнебеларускай моладзі да атрымання сярэдняй і вышэйшай адукацыі.



Будынак Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача. Архітэктары *А. Воінаў, Л. Усава*. 1956 г.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Скідзельскі гурток ТБШ. Красавік 1927 г.

Супраць паланізацыі адукацыі выступала Таварыства беларускай школы — масавая культурна-асветніцкая арганізацыя, створаная ў 1921 г. Ля вытокаў яе стварэння стаялі Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Станкевіч і інш. У 1920-я гг. ТБШ стварала беларускія школы, адкрывала бібліятэкі, клубы, хаты-чытальні, гурткі мастацкай самадзейнасці.

**Літаратура, жывапіс, музычнае мастацтва ў Заходняй Беларусі.** Заходнебеларуская літаратура развівалася ва ўмовах нацыянальнага прыгнёту. Разам з тым з'явіліся маладыя паэты, творчасць якіх была звязана з рэвалюцыйна-дэмакратычным кірункам у паэзіі, адлюстроўвала барацьбу беларускага народа за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Пратэст супраць нацыянальнага прыгнёту прысутнічаў у творчасці В. Таўлая, М. Машары, М. Засіма, М. Танка і многіх іншых маладых паэтаў Заходняй Беларусі.

Мастакі Заходняй Беларусі асаблівую ўвагу надавалі гісторыі, роднай прыродзе і народным тыпажам. Да найбольш вядомых мастакоў Заходняй Беларусі адносяцца П. Сергіевіч, Я. Драздовіч, М. Сеўрук, П. Южык, Б. Залкінд, С. Вішнеўскі, З. Крачкоўскі. Створаная імі галерэя вобразаў вельмі дакладна перадае атмасферу часу, стаўленне да навакольнага свету, нацыянальныя ідэалы прыгажосці. Творчасць гэтых мастакоў, выяўляючы яркую індывідуальнасць кожнага з іх, адлюстроўвае асноўныя тэндэнцыі развіцця рэалістычнага мастацтва 1920—1930-х гг.

Зборам і папулярызацыяй беларускага песеннага фальклору займаліся А. Грыневіч і Р. Шырма. У 1923 г. А. Грыневіч выдаў першы беларускі падручнік па музыцы «Навука спеву», а таксама «Дзіцячы спеўнік». Р. Шырма ўзначальваў шэраг мастацкіх калектываў — хары ў Пружанах, Віленскай беларускай гімназіі. Шырокую папулярнасць у 1930-я гг. набыў хор Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні пад яго кіраўніцтвам. У 1929 г. ён выдаў свой першы зборнік «Беларускія народныя песні».


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Якія падзеі грамадска-палітычнага жыцця Беларусі ў 1920—1930-я гг. у найбольшай ступені вызначылі развіццё беларускай культуры ў гэты перыяд? Сваё меркаванне абгрунтуйце.
2. Сфармулюйце 3 тэзісы, адлюстраваўшы ў іх асноўныя дасягненні сістэмы адукацыі БССР у 1920—1930-я гг.
3. Якія ўстановы культуры, навукі, адукацыі, створаныя ў БССР у 1920—1930-я гг., дзейнічаюць і сёння? На прыкладзе адной з іх, выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, пакажыце, якія змены адбыліся ў іх дзейнасці.
4. У чым праяўляліся адрозненні ў развіцці культуры на тэрыторыі БССР і Заходняй Беларусі?
5. Падрыхтуйце паведамленне (на выбар) аб адным з дзеячаў культуры Беларусі або аб развіцці якога-небудзь віду мастацтва (жывапіс, архітэктура, тэатр, скульптура і інш.) у 1920—1930-я гг.

# § 26. Развіццё беларускай савецкай культуры ў другой палове 1940-х — 1980-я гг.

§ 26

Якімі былі асноўныя дасягненні Савецкай Беларусі ў галіне культуры ў 1920–1930-я гг.?

**Асноўныя тэндэнцыі развіцця культуры Беларусі.** Вялікая Айчынная вайна і нацысцкая акупацыя нанеслі велізарны ўрон матэрыяльнай і духоўнай культуры БССР. Гітлераўцы знішчылі або вывезлі ў Германію значную частку культурнай спадчыны беларускага народа. Былі часткова або цалкам разбураныя музеі, бібліятэкі, тэатры, навуковыя і адукацыйныя ўстановы. Аднак па меры вызвалення тэрыторыі Беларусі ад акупантаў духоўнае жыццё рэспублікі адраджалася.

Вядучымі тэмамі ў літаратуры і мастацтве сталі Вялікая Айчынная вайна і пасляваеннае аднаўленне, сацыялістычнае будаўніцтва і працоўныя подзвігі ў мірны час.

**Стан адукацыі.** Да канца 1950-х гг. у БССР была адноўлена даваенная сетка агульнаадукацыйных школ. Колькасць вучняў у іх была значна меншай, што было звязана з людскімі стратамі падчас вайны. З 1949/1950 навучальнага года паступова пачала ўводзіцца абавязковая ўсеагульная 7-гадовая адукацыя, пераход да якой завяршыўся да сярэдзіны 1950-х гг. У канцы 1950-х — пачатку 1960-х гг. у БССР была ліквідавана непісьменнасць і малапісьменнасць дарослага насельніцтва. З 1958 г. у рэспубліцы ўводзілася 8-гадовая абавязковая

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ